Камплект з 60 выданняў перадалі культурна-адукацыйнаму аб'яднанню беларусаў у Іарданіі пры дапамозе Пасольства Беларусі ў Сірыі, перадае БелТА. Кнігі па гісторыі і культуры нашай краіны, мастацкія творы, слоўнікі і кнігі для дзяцей дастаўлены ў межах дабрачыннай акцыі «Аб Беларусі — беларусам замежжа», ініцыятарам якой выступіла Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Камплект сфарміраваны сумесна з Міністэрствам інфармацыі і Прэзідэнцкай бібліятэкай. «Гэта дапамога аб'яднанням беларускай дыяспары ў замежных краінах, а таксама распаўсюджванне інфармацыі аб нашай краіне, папулярызацыя інфармацыйных рэсурсаў, якія адлюстроўваюць багацце беларускай гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны», — расказалі арганізатары.